# РАЗДЕЛ 1. ИСТОЧНИКИ И ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ «ДОЛГОГО XIX ВЕКА»

*Матвейчык Д. Ч.*
Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Мінск

*Matveichyk Dz.*
National Historical Archives of Belarus, Minsk

**УДК [94+355.312(091)](476)«1863/1864»:930.2**

## ПАЛКАВЫЯ ГІСТОРЫІ ЯК ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ З'ЯВА Ў ДАСЛЕДАВАННІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. У БЕЛАРУСІ

## HISTORIES OF REGIMENTS AS A HISTORIOGRAPHICAL PHENOMENON IN SCHOLARCHIP ON THE 1863–1864 UPRISING IN BELARUS

*У артыкуле разглядаецца такі спецыфічны від прац, як палкавыя гісторыі, прысвечаныя дзейнасці асобных вайсковых адзінак (палкоў) расійскай арміі. Вылучаецца тая частка іх, што змяшчаюць звесткі па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі, раскрываецца гісторыя фарміравання комплексу адпаведных прац, паказваецца іх спецыфіка, даецца ацэнка іх зместу на прадмет дакладнасці пададзеных звестак, адзначаюцца некаторыя моманты, якія неабходна ўлічваць у цяперашні час пры выкарыстанні палкавых гісторый у навуковых даследаваннях.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; паўстанне 1863–1864 гг.; Расійская імперыя; гістарычная крыніца; палкавая гісторыя; палітычная прапаганда.*

*The article investigates such specific type of works as regimental stories, dedicated to the activities of separate military units (regiments) of the Russian army. The author highlights the part of them, containing the information on the history of the 1863–64 Rebellion in Belarus, reveals the history of formation of the complex of relevant works, shows their specificity, evaluates their contents for the accuracy of presented information, highlights some issues that have to be taken into account when using the regimental stories in studies at the present time.*

*Keywords: historiography; 1863–1864 Uprising; Russian Empire; historical source; history of regiment; political propaganda.*

У Расійскай імперыі ў XIX ст. актыўна пісаліся і выдаваліся гісторыі асобных вайсковых адзінак – як правіла, палкоў. Іх галоўная мэта – прапагандысцкая – паказаць у як мага больш станоўчым святле дзейнасць расійскай арміі і яе жаўнераў у разнастайных войнах і ваенных кампаніях. Як пісалася ў адным з такіх твораў – памятцы лейб-драгунскага палка, «апісанне жыцця палка называецца яго гісторыяй, кароткі пераказ гісторыі – памятка, а само слова памятка значыць, што ўсё, у ёй запісанае, кожнаму лейб-драгуну трэба ўтрымаць у памяці, каб заўжды памятаць, дзе і як вылучыўся родны яму полк» [20, с. 5].

Усяго да 1917 г. было выдадзена некалькі соцень такіх прац, што складае асобны пласт гістарыяграфіі. Пласт у пэўным сэнсе ўнікальны, бо адпаведныя працы з'яўляюцца амаль адзінымі ў сваім родзе ў дарэвалюцыйны перыяд, дзе разглядаўся такі бок, як непасрэдныя баявыя дзеянні. Усё гэта ў поўнай меры тычыцца таксама даследавання паўстання 1863–1864 гг. Справа ў тым, што ўсе комплексныя ці аглядныя працы па гісторыі паўстання, выпушчаныя расійскімі гісторыкамі ў гэты час (аўтарства Васілія Ратча, Мікалая Бэрга, Паўла Бранцава, Аляксея Сідарава і інш.), дадзенай праблеме надавалі вельмі слабую ўвагу, у асноўным канцэнтруючыся на палітычным баку і на змяненнях, якія ўносіліся ў палітыку імперыі. У сваёй пераважнай большасці ў іх закранаюцца толькі найбольш маштабныя ваенныя сутыкненні (напрыклад, бітва ля мястэчка Сямяцічы Бельскага павета альбо дзеянні супраць злучэння Зыгмунта Серакоўскага ў Ковенскай губерні), ды і тое вельмі павярхоўна, а асноўная частка баёў і сутычак, як і іх удзельнікаў, не разглядаецца і нават не згадваецца.

Працы, створаныя ў вышэйзгаданым накірунку, моцна розняцца паміж сабой, у сувязі з гэтым іх варта ўмоўна падзяляць на некалькі груп. Крытэрыямі для такога падзелу выступаюць аб'ём выдання і, адпа-

ведна, колькасць пададзеных у ім звестак, якая ў сваю чаргу з'яўляецца вынікам шырыні кола выкарыстаных крыніц:

- так званыя «памяткі» – як правіла, невялікія брашуры (да 50 старонак) з мінімальным наборам гістарычных звестак і багатай эмацыянальнай рыторыкай, разлічаныя ў першую чаргу на ніжэйшыя чыны;
- «кароткія гісторыі», у якія ўключана значна большая колькасць звестак і меншая колькасць прапагандысцкай рыторыкі, але якія рэдка перасягаюць аб'ём у 300 старонак;
- уласна «гісторыі» – аб'ёмныя працы (да некалькіх тамоў), заснаваныя на вялікай колькасці разнастайных гістарычных крыніц, якія з'яўляюцца вынікам паўнавартасных маштабных навуковых даследаванняў, хоць не пазбаўленыя прапагандысцкага складніку і тэндэнцыйнай інтэрпрэтацыі фактaлогіі.

Хаця, варта паўтарыцца, дадзены падзел і назвы груп будуць з'яўляцца ўмоўнымі, бо, па-першае, існуе вялікая колькасць памежных выданняў, якія могуць быць аднесены і да адной, і да другой групы, і, па-другое, пад вышэйпрыведзенымі назвамі могуць фігураваць выданні з іншай групы (напрыклад, пад назвай «Гістарычная памятка» выдадзена кароткая гісторыя 38-га Уладзімірскага драгунскага палка аб'ёмам каля 200 старонак). У назвах выданняў могуць фігураваць таксама тэрміны «нататнік» (рус. – «записная книжка»), «летапіс», «гістарычны нарыс» (альбо сінанімічнае «нарыс гісторыі»), «хроніка», «матэрыялы для гісторыі», «дадатак да гісторыі», «дзейнасць» і нават «баявыя подзвігі», «баявая слава», «баявое жыццё» і да т. п.

У падаўленні паўстання 1863–1864 гг. удзельнічала большая палова расійскай арміі, якая мелася на той час, таму адпаведныя звесткі ўключаны ў дастаткова вялікую колькасць палкавых гісторый. Найлепей у такіх працах адлюстраваны, варта паўтарыцца, ваенны бок паўстання – дыслакацыя і перамяшчэнні па тэрыторыі, даты і месцы сутычак, панесеныя і нанесеныя страты, змены ў кадравым складзе, атрыманыя ўзнагароды і інш. Сярод іх значная частка тычыцца гісторыі паўстання ў Беларусі.

У апошнія дзесяцігоддзі ўзрасла цікавасць да гісторыі паўстання ў цэлым, таму гісторыкі шукаюць новыя крыніцы для сваіх даследаванняў. Адпаведна, да палкавых гісторый, якія да нядаўняга часу былі практычна невядомыя беларускім навукоўцам, звяртаюцца ўсё часцей як да гістарыяграфічных крыніц, адкуль чэрпаюцца звесткі. Аднак нярэдка запазычванні адбываюцца механічным чынам – шляхам

простага перапісвання звестак без іх крытычнага аналізу. Гэта вымушае паказаць працэс складання комплексу палкавых гісторый, у якія ўключаны звесткі па гісторыі паўстання ў Беларусі, і прааналізаваць іх на прадмет ацэнкі гістарыяграфічнай каштоўнасці іх зместу.

Працэс фарміравання комплексу палкавых гісторый, куды ўключаны звесткі па гісторыі паўстання ў Беларусі, адбываўся нераўнамерна і на розных этапах меў свае асаблівасці. У 1860–1870-я гг. звесткі пра паўстанне ў Беларусі ўключаліся ў дастаткова невялікую колькасць прац. Храналагічна найбольш ранняй з таго комплексу, які разглядаецца ў гэтым артыкуле, варта прызнаць невялікую брашуру з апісаннем дзейнасці лейб-гвардыі драгунскага палка непасрэдна падчас паўстання, якая выйшла ў 1865 г. [11]. У асноўным яна закранае знаходжанне і сутычкі палка ў Ковенскай губерні, але змяшчае некаторыя згадкі пра дзейнасць у Віленскай (Ашмянскі, Вількамірскі, Троцкі паветы) і Віцебскай (Дынабургскі павет) губернях.

Найбольш грунтоўнай працай гэтага перыяду (ды і не толькі) стала «Гісторыя лейб-гвардыі Паўлаўскага палка», складзеная яго афіцэрамі Паўлам Воранавым і Уладзімірам Бутоўскім і выпушчаная ў свет у 1875 г. Яна грунтавалася на матэрыялах з цэлага шэрагу архіваў (палкавога, ваенна-навуковага, канцылярыі ваеннага міністэрства і інш.), а таксама апублікаваных нататак, артыкулаў і ўспамінаў. Некалькі раздзелаў прысвечаны дзейнасці палка ў Віленскай губерні (штаб палка знаходзіўся ў Вільні), асабліва ў Лідскім павеце супраць паўстанцкіх атрадаў Людвіка Нарбута, Фелікса Віславуха і Аляксандра Парадоўскага ўвесну і ўлетку 1863 г. [2, с. 405–446]. Тут разгледжаны не толькі непасрэдна ваенныя дзеянні, але і паказана становішча ў Вільні падчас паўстання, ахарактарызаваны адносіны да выступлення розных саслоўяў, дадзены ацэнкі дзейнасці некаторых асоб (Міхаіла Мураўёва і інш.) і г. д.

Вялікі стымул для напісання палкавых гісторый дала пераможная для Расіі ў ваенным плане руска-турэцкая вайна 1877–1878 гг., што стварала дадатковыя магчымасці для дзяржаўнай прапаганды праз дэманстрацыю ваенных поспехаў. У выніку ў 1880-я гг. выйшаў цэлы шэраг прац, куды, сярод іншага, уключаны звесткі пра падзеі паўстання ў Беларусі.

У 1883 г. з’явілася праца Мікалая Геніева па гісторыі Пскоўскага пяхотнага палка, у якой асобны раздзел прысвечаны дзейнасці супраць паўстанцаў у паўднёвай частцы Гродзенскай губерні і сумеж-

ных тэрыторыях Царства Польскага [4, с. 298–310]. Крыніцамі для яго напісання сталі дакументы з архіва палка і «Ваенна-навуковага архіва». Сярод іншага, у раздзеле разглядаюцца дзеянні расійскіх войскаў супраць паўстанцкіх атрадаў Рамана Рагінскага і Фелікса Улодака, і ў цэлым апісанне пра падзеі 1863 г. (перамяшчэнні па тэрыторыі, сутычкі з паўстанцамі, колькасць забітых і параненых і інш.) дастаткова падрабязнае.

У 1888 г. выйшаў трэці том «Гісторыі лейб-гвардыі Праабражэнскага палка», дзе частка чацвёртага раздзела прысвечана асвятленню ўдзелу палка ў баявых дзеяннях супраць паўстанцаў у Віленскай (Віленскі і Ашмянскі паветы) і Аўгустоўскай губернях [9, с. 294–336]. У працы таксама разглядаюцца і некаторыя іншыя аспекты, напрыклад, вобшук усяго горада Вільні пасля замаху на жыццё віленскага губернскага маршалка Аляксандра Дамейкі, агляды і парады палка, прыводзяцца тэксты некаторых дакументаў.

У 1889 г. была выдадзена «Хроніка лейб-гвардыі Маскоўскага палка», складзеная яго палкоўнікам Аляксандрам Ляпуновым на падставе вялікай колькасці дакументальных матэрыялаў. Яна моцна насычана фактàлагічнымі звесткамі, якія пры гэтым не паддадзены якой-небудзь істотнай сістэматызацыі за выключэннем іх падачы ў храналагічным парадку. Сярод іншага ў ёй маюцца звесткі пра дзейнасць супраць паўстанцаў у Лідскім і Троцкім паветах, у тым ліку супраць атрада Л. Нарбута [14, с. 254–266].

Таксама неабходна згадаць пра выхад другога выдання «Гісторыі лейб-гвардыі Паўлаўскага палка», якое ў апісанні падзей паўстання практычна не адрозніваецца ад першага, за выключэннем некаторых структурных змен [3, с. 219–246].

У цэлым палкавыя гісторыі 1880-х гг. вылучаюцца значным аб'ёмам, падрабязным разглядам падзей і шырокім выкарыстаннем запазычаных з крыніц звестак. У выніку ў навуковы ўжытак уводзілася вялікая колькасць фактаграфіі, якая тычылася ў першую чаргу баявых дзеянняў.

З 1890-х гг. традыцыя напісання палкавых гісторый толькі ўмацоўвалася, і колькасць адпаведных прац станавілася ўсё большай. Сярод іх варта назваць «Гісторыю лейб-гвардыі егерскага палка за сто гадоў», якая змяшчае звесткі пра некаторыя баявыя дзеянні ў Віленскай губерні (Троцкі і Лідскі паветы) [8, с. 345–350]; другі том «Гісторыі 2-га Драгунскага С.-Пецярбургскага генерал-фельдмарша-

ла князя Меншыкава палка», дзе змешчана апісанне дзейнасці палка ў Ковенскай і заходняй частцы Гродзенскай губерні, у тым ліку пра ўдзел у баі ля мястэчка Сямяцічы Бельскага павета (самага маштабнага падчас паўстання) [10, с. 450–484].

Асаблівую цікавасць мае праца Георгія Макрынскага «Гісторыя 113-га Старарускага палка», якая значную ўвагу надае дзейнасці 4-га батальёна Чарнігаўскага палка (з якога ў далейшым вырасце ўласна Старарускі) супраць паўстанцаў у Магілёўскай і Мінскай губернях [17, с. 211–260]. У прыватнасці тут падрабязна прасочваюцца рознага кшталту перамяшчэнні батальёна, сутычкі з паўстанцамі і інш. Так, тут змешчана апісанне бою ля маёнтка Тошчыца Рагачоўскага павета, дзе павінен быў сабрацца рагачоўскі паўстанцкі атрад пад камандаваннем Тамаша Грыневіча.

Працягвалі з’яўляцца кароткія палкавыя гісторыі, напрыклад, аўтарства Канстанціна Мрачкоўскага пра Стараінгерманландскі пяхотны полк, дзе маюцца некаторыя звесткі пра яго дзейнасць у 1863 г. у Навагрудскім павеце [18, с. 80–82]. Таксама варта згадаць пра «Памятку…» Маскоўскага палка, дзе паўстанню прысвечаны паўтары старонкі, але амаль выключна публіцыстычнага тэксту [21, с. 27–28].

Неабходна згадаць гісторыю 12-га пяхотнага Велікалуцкага палка (1911 г.), які дзейнічаў у Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губернях, у тым ліку ўдзельнічаў у баях ля вёскі Азярцы Ігуменскага павета супраць слуцкага паўстанцкага атрада, ля вёскі Юравічы таго ж павета супраць ігуменска-мінскага атрада, ля вёскі Глыбокі Кут Пружанскага павета супраць некалькіх аб’яднаных атрадаў Гродзенскай губерні, і інш. [13, с. 37–39]. У гэтым жа годзе выйшла праца Феадосія Ружанцова па гісторыі 2-га пяхотнага Сафійскага палка, якая змяшчае кароткія звесткі пра яго дзейнасць у Гродзенскай губерні – адзін абзац тэксту з пералікам чатырох сутычак, у якіх ён удзельнічаў з вясны па восень 1863 г. [26, с. 19–20]. Пэўную цікавасць мае праца Дзмітрыя Казлова, прысвечаная Яраслаўскаму пяхотнаму палку (1913 г.), дзе маюцца кароткія звесткі пра яго дзейнасць у 1863 г. у Магілёўскай і Мінскай губернях – бой ля вёскі Лочын Ігуменскага павета, разбіццё паўстанцкай групы Ільдэфонса Анцыпы ў Быхаўскім павеце і інш. [12, с. 55–57].

Цэлы шэраг прац быў выпушчаны ў 1890–1913 гг. Аляксеем Піражнікавым па гісторыі 10-га пяхотнага Новаінгерманландскага палка [22;

23; 24; 25], самай аб'ёмнай з якіх была апошняя. У ёй маецца асобны раздзел, прысвечаны разгляду дзейнасці палка ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях [25, с. 185–296]. Тут маецца апісанне сутычак на мызе Свечкі Вілейскага павета, дзе быў разбіты паўстанцкі атрад пад камандаваннем Юльяна Бакшанскага, ля вёскі Любкі (іншая лакалізацыя – ля мястэчка Іжа) Вілейскага павета супраць вілейска-свянцянскага атрада і вялікая колькасць іншых. Тут жа маюцца іменныя спісы афіцэраў палка, згаданы шматлікія расійскія вайскоўцы, якія ўдзельнічалі ў ваенных дзеяннях у 1863 г., падрабязна прасочаны перамяшчэнні асобных падраздзяленняў палка (рот, батальёнаў) і інш. Увогуле, гэтая праца – адна з самых інфармацыйна насычаных з усіх, дзе згадваецца паўстанне ў Беларусі.

Вышэй прыведзенымі спіс палкавых гісторый, у якія ўключаны звесткі пра падзеі паўстання ў Беларусі, не абмяжоўваецца. Усяго да 1917 г. іх было выпушчана некалькі дзясяткаў.

Што ж тычыцца асаблівасцяў выкарыстання палкавых гісторый у навуковых даследаваннях у цяперашні час, то тут варта адзначыць некалькі момантаў.

Па-першае, наконт дакладнасці звестак, змешчаных у палкавых гісторыях, варта адзначыць адзінае – яны ўсе патрабуюць верыфікацыі і параўнання з іншымі незалежнымі крыніцамі. Нават у межах адной працы могуць прысутнічаць як тыя, што пацвярджаюцца іншымі матэрыяламі, так і тыя, што імі абвяргаюцца. Варта прывесці для прыкладу працу А. Пірожнікава, у цэлым добра падрыхтаваную і з вялікай колькасцю канкрэтыкі. Сярод іншага, у ёй маецца апісанне бою ля вёскі Азярцы Ігуменскага павета наступнага зместу: «Прасоўваючыся наперад, стралковы ланцуг хутка заўважыў мяцежнікаў, якія адкрылі агонь з занятых імі кустоў. Перастрэлка працягвалася каля чвэрці гадзіны. Непрыяцель не вытрымаў і пачаў уцякаць, пераследаваны казакамі, якія былі ў атрадзе. У гэтым жа баі з нашага боку забіты адзін казак і адзін конь і паранены гарніст, які хутка памер. Непрыяцель заплаціў тут трыма забітымі і чатырнаццаццю параненымі. Апрача таго, 37 чалавек трапілася ў палон. Разбягаючыся, мяцежнікі пакінулі на полі бітвы 73 стрэльбы, 17 коней і баявы рыштунак» [25, с. 290]. Гэтае апісанне амаль цалкам адпавядае іншаму, зробленаму ваенным начальнікам Слуцкага павета палкоўнікам Арцеміем Астахавым, якое ён зрабіў у рапарце на імя мінскага цывільнага губернатара Аляксандра Кажэўнікава, што захаваўся ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі:

«Падышоўшы на 50 крокаў, заўважыў іх у густых кустах. Адкрыўшы агонь, узмацніўшы пры гэтым ланцуг, адбыўся непрацяглы, але ўпарты бой. Пры першых стрэлах праціўнік страціў свайго начальніка, адстаўнога капітана артылерыі памешчыка Машэўскага. Паводле словаў палонных, яго страта і шматлікасць ахвяр каля сябе ад трапнага і частага агню стралкоў прывялі іх у поўную збянтэжанасць. Пакінуўшы сваю пазіцыю, яны пусціліся наўцёкі праз паляну. Тут спадар Драгапула загадаў казакам кінуцца ў атаку. Тады мяцежнікі, пабегшы да балота, пачалі кідаць усялякую сваю зброю і хавацца ў лес. З той прычыны, што ўсё гэта адбывалася позна ўвечары, далейшае праследаванне было немагчымым. Страты мяцежнікаў, трэба меркаваць, значныя, 3 з іх забіта на месцы, паранена 14 і ўзята ў палон 31. З нашага боку забіты 1 казак, цяжка паранены 1 гарніст, які памёр на наступны дзень. Пры гэтым узята: стрэльбы, пісталеты, шаблі, косы, порах, кулі, свінец, коні, ведамасць на якіх да гэтага дадаю» [19, арк. 7–10].

Як бачна, уся розніца ў апісаннях заключаецца ў колькасці палонных, якая можа быць вынікам проста памылковага расчытання лічбы «37» пры складанні кнігі (хаця ў дададзеным самім жа А. Астахавым іменным спісе палонных маюцца 33 пазіцыі [19, арк. 11–12 адв.]). Ва ўсім астатнім змешчаныя двума расійскімі афіцэрамі звесткі цалкам адпавядаюць адныя другім, хоць таксама бачна, што тэксты з’яўляюцца ўзаеманезалежнымі. Аднак ужо на наступнай старонцы працы А. Піроўжнікава маецца апісанне іншага бою, зробленае наступным чынам: «Шайка Дубоўскага (ён жа Дыбоўскі) <…> 2-га траўня была дагнана 3-й ротай Новаінгерманландскага палка капітана Антонава. Ля м. Янаўка Ігуменскага павета яна пачала ўцякаць, страціўшы 12 чалавек забітымі, сярод якіх быў і сам Дубоўскі» [25, с. 291]. Гэтае апісанне ўжо змяшчае некалькі памылак. Па-першае, назва мястэчка не Янаўка, а Валяр’яны (Валяр’янава) (у цяперашні час – вёска Любяцкага с/с Уздзенскага раёна Мінскай вобласці). Па-другое, камандзір атрада Павел Дыбоўскі не загінуў у гэтым баі, а яшчэ доўга камандаваў атрадам, пасля паўстання жыў у эміграцыі, у ссылцы і на радзіме і памер пасля 1882 г. [16, с. 209]. Апрача таго, застаецца сумнеўнай лічба забітых паўстанцаў, бо Валерыян Валодзька, які ўваходзіў у склад атрада і бачыў падзею на ўласныя вочы, у сваіх успамінах увогуле не паведамляе ні пра якіх-небудзь загінулых, ні пра бой як такі [30, s. 220–221]. Адзінае, у чым абодва апісанні сыходзяцца, гэта – хуткія ўцёкі паўстанцаў. На тое, што сутычка не мела такіх маштабаў і вынікаў, як напісана А. Піроўжнікавым,

ускосна ўказваюць таксама ўспаміны Апалінарыя Свентарэцкага, які таксама знаходзіўся ў атрадзе П. Дыбоўскага і ва ўспамінах якога яна нават не згадваецца [31].

Менавіта гэтая рыса яскрава ўказвае на тое, што бескрытычнае выкарыстанне палкавых гісторый як гістарыяграфічных крыніц і прамое запазычванне звестак з іх з'яўляюцца на сённяшні дзень памылковым у метадычным плане і недапушчальным.

Па-другое, пры пошуку неабходных звестак пра дзейнасць тых ці іншых палкоў неабходна ўлічваць той факт, што ў 1863 г. расійская армія знаходзілася ў стадыі сваёй рэарганізацыі, у якую падзеі паўстання ўнеслі свае карэктывы. Адной са складовых частак дадзенага працэсу было змяненне назваў палкоў і стварэнне новых адзінак.

Напрыклад, расійскі падпалкоўнік (на 1863 г.) Сяргей Зыкаў у сваіх мемуарах паведамляе, што ў 1863 г. ён дзейнічаў супраць атрада паўстанцаў пад камандаваннем Баляслава Свентарэцкага і Станіслава Ляскоўскага ў Ігуменскім павеце «са сваімі дзвюма ротамі Смаленскага і Арлоўскага палкоў» [6, с. 363]. Палкавыя гісторыі двух згаданых палкоў былі выдадзены: першага ў 1901 г. [15] і другога ў 1911 г. [5]. Аднак у іх адсутнічаюць звесткі пра тое, што яны дзейнічалі ў Ігуменскім павеце і ўвогуле ў Беларусі ў 1863 г. – першы з іх дзейнічаў у Царстве Польскім, другі – на тэрыторыі Украіны. Справа ў тым, што ўвесну 1863 г. абодва палкі зведалі значную рэарганізацыю. Так, з 4-га рэзервовага батальёна Смаленскага пяхотнага палка, а таксама з яго 5-га і 6-га батальёнаў, складзеных з новых рэкрутаў і выкліканых з рэзерву бестэрмінова адпушчаных жаўнераў, быў сфарміраваны асобны Смаленскі пяхотны рэзервовы полк, які ў жніўні 1863 г. быў перайменаваны ў Яраслаўскі пяхотны і ўвесну 1864 г. атрымаў нумар 117. І ў палкавой гісторыі Яраслаўскага палка сапраўды, як ужо сказана вышэй, падаюцца кароткія звесткі пра дзейнасць супраць паўстанцаў на тэрыторыі Беларусі. Тое ж самае тычыцца Арлоўскага пяхотнага палка – паводле такой жа схемы з яго часткі ў красавіку 1863 г. быў сфарміраваны Арлоўскі пяхотны рэзервовы полк, які ў жніўні перайменаваны ў Варонежскі пяхотны і ўвесну 1864 г. атрымаў нумар 124. Хаця палкавая гісторыя апошняга напісана не была. Аналагічная сітуацыя назіраецца з Малаяраслаўскім пяхотным палком, які «вырас» з Крэменчускага і з красавіка па жнівень 1863 г. называўся Крэменчускім рэзервовым. У хроніцы і памятцы Малаяраслаўскага пяхотнага палка маюцца кароткія звесткі пра дзейнасць супраць паўстанцаў [1; 29].

Па-трэцяе, звесткі пра адзін і той жа бой могуць змяшчацца ў некалькіх палкавых гісторыях. Гэта вынікае з таго факту, што падчас паўстання асобныя роты палкоў былі размешчаны па дастаткова разлеглай прасторы, пры частых перамяшчэннях у пагонях за паўстанцкімі атрадамі ахоплівалі яшчэ большую тэрыторыю, а таму часта пераходзілі на месцы дыслакацыі суседніх палкоў і дзейнічалі разам з іх структурнымі адзінкамі, утвараючы на кароткі час зводныя групы (атрады), падпарадкаваныя адзінаму камандзіру. Так, звесткі пра бой ля вёскі Уладыкі Вілейскага павета ўключаны ў гісторыю Велікалуцкага [13, с. 38] і Новаінгерманландскага [25, с. 291] палкоў. Прычым паміж імі маецца розніца ў некаторых звестках, напрыклад, у колькасці панесеных страт. Так, гісторыя Вялікалуцкага палка паведамляе пра 14 расійскіх вайскоўцаў (называюцца паіменна), якія загінулі пад Уладыкамі, і 29 параненых, а А. Піроржнікаў у гісторыі Новаінгерманландскага – пра 7 забітых і 33 параненых. Пры гэтым А. Піроржнікаў падае неверагодную лічбу страт паўстанцаў – нібыта 70 чалавек былі забіты і 80 патанулі ў рацэ (прытым, што рака Ілія, на беразе якой адбываўся бой, не вылучаецца шырынёй і глыбінёй). Гісторыя ж Вялікалуцкага палка ўвогуле не паведамляе пра страты паўстанцаў. Хаця з іншага боку абодва паведамленні абвяргаюць сцвярджэнне пра тое, што паўстанцкі атрад быў атакаваны падчас пераправы (гл., напрыклад, манаграфію Анатоля Смірнова [28, с. 214]). Так, паводле А. Пірожнікава, да пачатку бою паўстанцы «перайшоўшы ўброд р. Ілію, занялі ў невялікім лесе выгадную пазіцыю»; паводле аўтара гісторыі Вялікалуцкага палка, паўстанцкі атрад «стаяў лагерам ля вёскі Уладыкінай Вілейскага павета».

Таксама ў абодва творы ўключаны звесткі пра вышэйзгаданы бой ля в. Азярцы, але ў вельмі розным аб'ёме – А. Піроржнікаў апісвае яго, як паказана вышэй, дастаткова падрабязна, а гісторыя Велікалуцкага палка абмяжоўваецца адной фразай «21 красавіка 1-я стралковая рота праследавала шайку інсургентаў ля в. Азярцы» [13, с. 37], хаця камандаваў зводным атрадам расійскіх вайскоўцаў менавіта афіцэр Велікалуцкага палка – падпалкоўнік Іван Драгапулаў. Прычым наконт абставінаў фарміравання зводнага атрада А. Піроржнікаў пакідае цікавае паведамленне – «сустрэча гэтая адбылася цалкам выпадкова» [25, с. 290].

Аналагічны прынцып неабходна ўжываць пры пошуку звестак пра дзейнасць некаторых паўстанцкіх атрадаў, якія перамяшчаліся па дастаткова значных тэрыторыях і таму траплялі ў поле ўвагі розных палкоў. Таксама неабходна ўлічваць нярэдкую ратацыю расійскіх

войскаў, калі на адных і тых жа тэрыторыях у розны час дзейнічалі розныя вайсковыя адзінкі. Напрыклад, сутычкі з атрадам Людвіка Нарбута ў Лідскім павеце адлюстраваны ў вышэйзгаданых гісторыі Паўлаўскага і хронікі Маскоўскага лейб-гвардыі палкоў.

Па-чацвёртае, у некаторых гісторыях звесткі пра дзейнасць палкоў падчас паўстання проста адсутнічаюць. Напрыклад, улетку 1863 г. у Ашмянскім павеце знаходзіліся часткі Астраханскага грэнадзёрскага палка [9, с. 320], аднак у яго палкавой гісторыі, якая выйшла ў 1889 г. [27], няма ані слова пра падзеі паўстання і пра дзейнасць падчас яго. Тое ж самае тычыцца 119-га Каломенскага пяхотнага палка, які быў сфарміраваны ў 1863 г. з частак Алексапольскага пяхотнага і дзейнічаў у Магілёўскай і Мінскай губернях – у яго памятцы ад 1891 г. удзел у задушэнні паўстання нават не згаданы [7], хаця рота менавіта гэтага палка 28 красавіка 1863 г. разбіла магілёўскі (чарнаруцкі) паўстанцкі атрад ля вёскі Славені Сенненскага пав. Верагодна, аўтары такіх гісторый альбо не мелі неабходных дакументаў для ўключэння ў свае творы адпаведных тэматычных блокаў, альбо не лічылі ўдзел у кампаніі 1863–1864 гг. дастаткова важным, у параўнанні з удзелам у іншых кампаніях (напрыклад, у руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг.), каб надаваць яму хоць нейкую ўвагу.

Такім чынам, палкавыя гісторыі з’яўляюцца важнай і неад’емнай часткай расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі. Іх выкарыстанне з’яўляецца абавязковым пры правядзенні маштабных навуковых даследаванняў і напісанні комплексных прац па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі. У іх найлепей адлюстраваны ваенны бок паўстання – баявыя дзеянні. Аднак з прычыны некрытычнага стаўлення іх аўтараў да крыніц у іх змест трапіла вялікая колькасць неправераных і памылковых звестак. Таму механічнае запазычванне з іх складу неабходнага матэрыялу з’яўляецца недапушчальным на цяперашні час. Пры правядзенні эўрыстычнай работы падчас даследаванняў таксама неабходна ўлічваць асаблівасці рэарганізацыі расійскай арміі ў 1860-х гг., акалічнасці дзейнасці яе структурных адзінак падчас паўстання, а таксама спецыфіку складання саміх палкавых гісторый.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Борисов, В. Е.* Хроника 116-го пехотного Малоярославского полка: Выписка из «Исторического журнала» 116-го Пехот. Малояросл. полка, хранящегося в Полковом музее / В. Е. Борисов. – Рига, Гагенсберг: тип. И. Больц, [190?]. – 22 с.

2. *Воронов, П. Н.* История Лейб-гвардии Павловского полка. [1726–1875] / П. Н. Воронов, В. Д. Бутовский. – Санкт-Петербург: тип. М. Эттингера, 1875. – 619 с.

3. *Воронов, П. Н.* История лейб-гвардии Павловского полка. 1790–1890: в 2 ч. / П. Н. Воронов [и др.]. – Санкт-Петербург: [б/и], 1890. – 519 с. разд. паг., 43 л. цв. ил.

4. *Гениев, Н. И.* История Псковского пехотного, генерал-фельдмаршала князя Кутузова Смоленского полка. 1700–1881 / Н. И. Гениев. – Москва: тип. А. Иванова, 1883. – [437] с., портр., ил., карт.

5. *Зеленко, К. В.* Краткий исторический очерк двухсотлетней службы 36-го пехотного Орловского полка / К. В. Зеленко. – Кременчуг: тип. И. А. Диковского, 1911. – 212 с. с ил.; 4 л. портр.

6. *Зыков, С. П.* Наброски из моей жизни / С. П. Зыков // Русская старина. – Т. 142. – № 5. – С. 349–372.

7. Историческая памятка 119-го Коломенского пехотного полка / сост. поручик Островский. – Минск: Типо-литография Б. Н. Соломонова, 1891. – 28 с.

8. История лейб-гвардии Егерского полка за сто лет. 1796–1896: в 2 ч. – Санкт-Петербург: Тип. Тренке и Фюсно, 1896. – 524+189+171 с.

9. История Лейб-гвардии Преображенского полка. – Т. 3: 1801–1883 / сост. С. Долгов [и др.]; рис. виньеток проф. А. Шарлеманя. – Санкт-Петербург: Издание Лейб-гвардии Преображенского полка, 1888. – 696 с.

10. *Каменский, Е. С.* История 2-го Драгунского С.-Петербургского генерал фельдмаршала князя Меншикова полка. 1707–1898 гг. / Е. С. Каменский. – Т. 2. – Москва: тип. Вильде, 1900. – VIII, 624, 93, [5] с., 31 л. ил., карт.

11. *Ковалевский, М. А.* Поход лейб-гвардии драгунского полка 1863 года в Виленский военный округ. – Санкт-Петербург: тип. А. А. Краевского, 1865. – 28 с.

12. *Козлов, Д. Ф.* Краткая боевая история 117 пехотного Ярославского полка 1763–1913 гг. / Д. Ф. Козлов. – Рогачёв: тип. насл. Залкинда, [1913]. – 90 с., 5 л. ил.

13. Краткая история 12-го пехотного Великолуцкого полка: в 2 ч. – Москва: тип. Штаба Закаспийск. обл., [1911]. – 334, III с., 24 л. ил., карт.: ил.

14. *Ляпунов, А. Я.* Хроника лейб-гвардии Московского полка. 1811–1879 / А. Я. Ляпунов. – [б/м]: Канцелярия Лейб-гвардии Московского полка, 1889. – 395 с.

15. *Максутов, В. П.* История 25-го пехотного Смоленского полка за два века его существования. (1700–1900) / В. П. Максутов. – Санкт-Петербург: [б/и], 1901. – 115 с.

16. *Матвейчык, Д. Ч.* Удзельнікі паўстання 1863–1864 гадоў: біяграфічны слоўнік (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / Д. Ч. Матвейчык. – Мінск: Беларусь, 2016. – 735 с.

17. *Мокринский, Г.* История 113-го Старорусского пехотного полка (1796–1896) / Г. Мокринский. – Санкт-Петербург: тип. И. Гольдберга, 1900. – 453 с.

18. *Мрочковский, К. И.* Краткая история 9-го пехотного Староингерманландского генерал-фельдмаршала Михаила Голицина полка. Для нижних чинов. 1703–1892 / К. И. Мрочковский. – Москва: Типо-лит. В. А. Просина, 1892. – [4], 123 с. с ил., 2 л. ил.

19. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1537. – Рапарты ваеннага начальніка і земскага спраўніка Слуцкага павета, жыцінскага благачыннага Бабруйскага павета аб з'яўленні паўстанцкіх атрадаў у паветах. 26.05.1863–15.09.1864. – 30 арк.

20. Памятка лейб-драгуна. 1814–1914 / сост. И. М. Кучевский. – Санкт-Петербург: Т-во Р. Голике и А. Вильборг, 1914. – 78 с.: ил.

21. *Пестриков, Н. С.* Памятка нижних чинов лейб гвардии Московского полка / Н. С. Пестриков. – Санкт-Петербург: тип. Глазунова, 1903. – 45 с.

22. *Пирожников, А. И.* К столетнему юбилею 10-го пехотного Новоингерманландского полка. 1790–1890 гг. / А. И. Пирожников. – Нижний Новгород: [б/и], 1890. – 164 с.

23. *Пирожников, А. И.* Краткая история 10-го пехотного Новоингерманландского полка / А. И. Пирожников. – Калуга: [б/и], 1894. – 335, 2 с.; 2 л.план., портр.

24. *Пирожников, А. И.* Памятка новоингерманландца. 1790–1909 гг. / А. И. Пирожников. – Тула: электропеч. и тип. И. Д. Фортунатова насл., 1909. – 48 с.: ил.

25. *Пирожников, А. И.* История 10-го Пехотного Новоингерманландского полка / А. И. Пирожников. – Тула: Электропеч. и тип. И. Д. Фортунатова насл., 1913. – [2], 4, 426, 4 с., 1 л. ил., 4 л. карт.

26. *Руженцов, Ф.* Краткая история 2-го Пехотного Софийского императора Александра III полка за сто лет его существования: 17 янв. 1811 г. / Ф. Руженцов. – 17 янв. 1911 г. – Смоленск: Губ. тип., 1911. – 24 с.: портр.

27. *Саранчов, Е. Е.* 12-й гренадерский Астраханский Его Величества полк в походно-боевой службе Царю и Отечеству: Чтения для солдат / Е. Е. Саранчов. – Москва: Типо-литография Высочайше утвержд. т-ва И. Н. Кушнеров и К°, 1889. – VII, 208, 41 с. с ил.; 19 л. карт, портр.

28. *Смирнов, А. Ф.* Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии / А. Ф. Смирнов. – Москва: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 392 с.

29. *Тимошенко, В. В.* Боевая служба 116-го Малоярославского полка / В. В. Тимошенко. – Рига: тип. газ. «Rigaer Tageblatt» (В. Шефферса), 1897. – 32 с.

30. *Koszczyc, W.* Wspomnienia z powstania województwa mińskiego w r. 1863 / W. Koszczyc. // Polska w walce. Zbiór wspomnień i pamiętników z dziejów naszego wyjarzmienia / Wydał A. Giller. – T. 2. – Kraków: A. Nowolecki, 1875. – S. 182–315.

31. *Kowalewska, Z.* Ze wspomnień wygnańca [Apolinarego Świętorzeckiego z roku 1863] / Z. Kowalewska. – Wilno: Józef Zawadzki, 1911. – 262 s.

**(Дата паступлення: 07.12.2019).**